Пры выкарыстанні індывідуальна-аўтарскіх эпітэтаў узнікае новы падтэкст. Гэтыя эпітэты вызначаюцца арыгінальнасцю і самабытнасцю і адлюстроўваюць індывідуальныя асаблівасці асэнсавання рэчаіснасці [2, с. 349]. Характарызуючы прадмет, аўтар вылучае якасці, уласцівасці, якія, на першы погляд, не спалучальныя з пэўным прадметам, але стаўшы побач, гэтыя эпітэты дапамагаюць стварыць яркія, непаўторныя малюнкі. Аўтарскія вобразныя азначэнні дапамагаюць пісьменніку «нават у сцёртым, прывычным, экспрэсіўна-нейтральным словы адкрыць новы нечаканы сэнс» [3, с. 112].

З дапамогай індывідуальна-аўтарскіх аказіянальных эпітэтаў пісьменнік стварае незвычайныя вобразныя малюнкі: ***Глухая злосць*** *на праклятую гару падымалася ў сэрцы людзей («Жывая вада»); Заскрыпелі, застагналі* ***гладкакамлёвыя*** *хвоі. . . («Стары лес»); Вось сашчапіліся два асілкі: магутны, прысадзісты, гузаваты* ***звязісты*** *дуб. . . («Стары лес»); Вада ўжо збегла з лугоў, на іх зарастаў зялёны кажушок маладой травіцы, пахла* ***ўраджайнаю*** *вільгаццю («Чыя праўда?»).*

Індывідуальна-аўтарскія эпітэты напоўнены арыгінальным зместам, незвычайнай спалучальнасцю з паясненым словам. Удалыя канструкцыі з мастацкімі эпітэтамі даюць пісьменніку магчымасць стварыць багаты эстэтычны свет.

Такім чынам, выкарыстанне эпітэтаў робіць твор вобразным, яркім, дапамагае данесці да чытача аўтарскае разуменне рэчаіснасці.

**Спіс крыніц**

1. *Гаўрош, Н В.* Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. В. Гаўрош. — Мінск. : Выш. шк., 1998. — 603 с.

2. *Сувалка, Т.* Вобразнае азначэнне ў апошніх творах Васіля Быкава / Т. Сувалка // Мова — Ліратура — Культура: матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя праф. Льва Міхайлавіча Шакуна), Мінск, 16 — 17 лістапада 2006 года. — Мінск : Права і эканоміка, 2007. — 646 с.

3. *Рагойша В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 2-е выд., дапрац. і дап. — Мінск. : Выш. шк., 1987. — 414 с.

***Ж. Л. Трафімюк***
*Навуковы кіраўнік — Е. І. Белая,*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## АБ ТРАДЫЦЫІ ВЫКАРЫСТАННЯ ЎЛАСНЫХ ІМЁНАЎ У ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Да ліку важнейшых праблем чалавечага быцця адносіцца ідэнтыфікацыя асобы (сваёй і чужой), а таксама той сітуацыі, у якой яна знаходзіцца і ў адпаведнасці з якой выбірае пэўную стратэгію паводзін, узаемадзеяння з навакольным светам. Менавіта літаратура на працягу стагоддзяў забяспечвала чалавека ідэнтыфікацыйнымі формуламі, якімі ён шырока і часам несвядома карыстаўся ў штодзённым жыцці. Адным са складнікаў гэтай формулы, бясспрэчна, выступае імя. Але і сама літаратура не толькі прадуцыруе гэтыя формулы, а і мае патрэбу ў іх пастаянным удакладненні.

Для сучаснай навукі ўвогуле характэрная антрапацэнтрычнасць. Цікавасць да мастацкай антрапанімікі з’уляецца прыватнай праявай гэтай універсальнай тэндэнцыі. Імёны ўласныя адыгрываюць важную ролю ў пазнанні гісторыі, культуры, мовы народа. Акрамя таго, літаратурныя антрапонімы — элемент, значны для разумення і адэкватнай інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту. У Сярэднявеччы лічылася, што імя — гэта занадта няпэўнае абазначэнне, таму дапаўнялі яго прозвішчам, якое нярэдка паходзіла ад назвы мясцовасці. З гэтага вынікала, што імя належыць свету ўяўлення, а прозвішча — свету традыцыі.

Для вызначэння сапраўдных маштабаў гістарычнай значнасці асобы пісьменнікі звяртаюцца да сістэмы разнастайных мастацкіх прыёмаў і сродкаў, сярод якіх значнае месца займаюць антрапонімы. Так, у аповесці «Нядоля Заблоцкіх» Л. Калюга піша: «Самае першае — як зваўся чалавек <…> Другое: што ён быў за чалавек?» [4, с. 218]. Сэнс пытання празаік раскрывае на вобразе старога Заблоцкага, які «быў чалавек старасвецкі, ды імя сабе меў старасвецкае… – Савэрын» [4, с. 219]. <…> І ўсё ў Савэрына рабілася па-старасвецку. Усякі ў яго меў сваё месца і сваю работу. Таму не былі дурнямі… Гэтай работы ды Савэрынавага слова трымаўся кожны, і ўсё ў пару зроблена было: у пару з поля збіралі, у пару і ў меру бралі са свірна што трэба на свой абыходак… Пырніку, бывала, і на лякарства не знойдзеш на Заблоцкіх полі» [4, с. 219]. На ўсё парадак пры Савэрыне быў. «Як прыйдзецца за стол садзіцца, дык галоў, як качаноў на капуснай градзе… Тады і нявесткі, і ўнукі – усе ў лік. А як пойдуць за работаю, дык нікога лішняга і не відаць. Усякі мае свой занятак. А па Савэрынавай смерці… сышла тады недзе злагада ад Заблоцкіх, уцёк спакой з іх хаты. Перш-наперш кінулі Заблоцкія, усёю сваёю сям’ёю, застолле заняўшы, гаварыць самі з сабою, са смешных здарэнняў разам выскаляцца. Пачалі ад тых дат круціць светам Заблоцкія» [4, с. 220]. Здрабненне чалавечай асобы паказана Калюгам праз дэталь знешнасці: «Не было на іх росту: усе да аднаго аршын з шапкаю ўдаліся на вышкі. А ўсё цягнуліся ўгору, каб над усімі вышэй быць, каб адусюль іх бачылі» [4, с. 220].

Думаецца, незнарок абраў і М. Гарэцкі для свайго героя з апавядання «Амерыканец» прозвішча Балазевіч: ад «балазе» — «тым больш што», «добра што». Роздум над паходжаннем выяўляе, што ў вырашэнні праблемы, як жа пазіраць на Амерыку — ці як на новую радзіму, ці на «нейкі этап на шляху вышукання лепшай долі ранейшай бацькаўшчыны», — «герой не меў і не мае нейкага цвёрдага падмуроўку» [1, с. 101]. Усім, хто знаёмы з творчасцю Гарэцкага, вядома і імя героя, які мае аўтабіяграфічныя рысы. Гэта Лявон Задума. Асабліва дэталёва даследуе пісьменнік псіхалогію свайго героя ў час яго знаходжання на франтах першай сусветнай вайны. У антычныя часы, як адзначаюць даследчыкі, «чалавек ваюючы» быў скульптурны, да сярэдзіны XIX стагоддзя ён быў жывапісны; у войнах XX стагоддзя ён не прыгожы, не жывапісны, але больш чым калі задуменны, засяроджаны, захаваны ад пабочнай увагі [2, с. 194]. Самай высокай ступенню «думання», імкненнем зразумець свет і сябе ў ім валодае мастак, пісьменнік. Як бачым, у імені героя Гарэцкага азначана яго вызначальная рыса: ён напружана разважае, а гэта знак, сігнал таго, што ў асобе адбываюцца змены. Так, напрыклад, Лявон пачынае актыўна пазнаваць сябе ў нацыянальных адносінах.

Героя апавядання К. Чорнага «Семнаццаць год» завуць Пятро Тадаровіч. Пісьменнік праводзіць яго па пакутах ваеннага часу. Спачатку Пятро ваяваў, потым, як і многія беларусы, стаў выгнаннікам разам са сваім сынам. Жонка яго памерла на цяжкіх дарогах у чужы свет. Бязлітасны лёс таксама ў хуткім часе разлучыў яго і з сынам. Вярнуўшыся з выгнання, Пятро «хаты… не знайшоў, ледзьве пазнаў тое месца, дзе яна калісьці стаяла». Застаўся на месцы толькі камень, які раней падпіраў з вуліцы вугал. Цалюткі дзень прасядзеў ён на гэтым камені… Хутчэй за ўсё К. Чорны невыпадкова акцэнтаваў увагу на гэтай асаблівасці паводзін героя, як нездарма абраў яму імя. М. Мантэнь некалі заўважыў: «…Звычка цярпліва працаваць — гэта тое ж, што звычка цярпліва трываць боль» [3, с. 169]. «Пётр» у перакладзе з грэчаскай азначае «камень». Гэта абумоўлівае ўяўленні пра героя, звязаныя не толькі з канкрэтным характарам-тыпам, а і тым часам, у якім ён жыве і дзейнічае. Яшчэ з біблейскіх часоў склаліся і замацаваліся ў вуснай народнай творчасці і культуры ўстойлівыя маўленчыя формулы, звязаныя са словам «камень»: камень на камені; час раскідаць камяні і збіраць іх; пад ляжачы камень вада не цячэ… Пятро то «кідаўся… у вялікую роспач, калі думаў пра адзінага свайго сына, які дзесьці «бадзяецца па свету», думаў пра сям'ю, што загінула на чужых дарогах, пра сваё адзіноцтва; то апаноўвала яго радасць і ўздым да працы і дзейнасці… І зноў ён вырашаў: «трэба пачынаць усё спачатку». [5, с. 182]. І ён пачынаў…

У рамане М. Зарэцкага «Вязьмо» праз імя галоўнага героя выяўляецца аўтарскае разуменне сапраўднай, гуманістычнай сутнасці «новага чалавека», якім выступае камсамолец Віктар. Значэнне гэтага імені агульнавядома — «пераможца». У той час як многія падобныя вобразы былі ўвасабленнем «голай ідэі», Віктар паказаны пісьменнікам ва ўсёй паўнаце жыцця. Як і належыць юнаку, ён кахае, сумняваецца, пакутліва разважае над складанымі пытаннямі жыцця. М. Зарэцкі падрыхтаваў свайму герою няпросты жыццёвы шлях у межах дзеяння, адлюстраванага ў рамане. Але менавіта з вобразам Віктара звязана аптымістычнае гучанне твора, у тым ліку надзея на жыццяздольнасць утворанага на добраахвотных пачатках калгаса «Наша перамога».

Знаёмства з творамі беларускай літаратуры паказвае, што імёны і прозвішчы, якімі пісьменнікі надзялялі сваіх герояў, былі пераважна «гаваркімі» па сваёй марфалогіі ці этымалогіі і часта з'яўляліся актыўным, нават вядучым, сродкам стварэння і характарыстыкі вобраза. Імя ўласнае ў беларускай прозе выступае таксама важкім сродкам тыпізацыі, надае вобразу абагульняючы сэнс. Адсутнасць уласных імён, замена іх прозвішчамі-»ярлыкамі» сведчыць пра нявыяўленасць духоўнай сутнасці герояў і пацвярджае думку, што без імені чалавек яшчэ не ёсць чалавек ні для сябе, ні для іншых, бо ён не з'яўляецца суб'ектам міжасабовых адносін.

**Спіс крыніц**


1. *Гарэцкі, М.* Прысады жыцця: апавяданні, аповесці / Максім Гарэцкі; уклад. Т. Голуб. — Мінск. : Маст. літ., 2003. — С. 313 — 433.
2. *Иванов, А.* И. Первая мировая война и русская литература 1914-1918 гг. : этические и эстетические аспекты: Диссертация доктора филологических наук. / А. И. Иванов. —— Москва, 2005. — 474 с.
3. *Монтень, М.* Опыты. Избранные произведения в 3 т. Т. 1. Перевод с фанцузского. / М. Монтень. — Москва. : Голос, 1992. – 416 с.
4. *Калюга, Л.* Ні госць ні гаспадар: апавяданні і аповесці / Л. Калюга. — Мінск: Маст. літ., 1974. — 290 с.
5. *Чорны, К.* Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1972. Т. 2. Апавяданні 1928 — 1944 гг. — 488 с.



***Ю. А. Трыбуль***
*Навуковы кіраўнік — В. Ю. Бароўка*
Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь


## ПАЭТЫКА ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНАСЦІ Ў АПОВЕСЦІ АНДРЭЯ ФЕДАРЭНКІ «СІНІЯ КВЕТКІ»

Даследаванне творчасці А. Федарэнкі на прадмет інтэртэкстуальных элементаў мэтазгодна пачаць з супастаўляльнага аналізу яго аповесці «Сінія кветкі» і рамана Наваліса «Генрых фон Офтэрдзінген».

Першым трапляе пад увагу вобраз сіняй кветкі, які прысутнічае ў абодвух творах і з'яўляецца цэнтральным. Спасылаючыся на веданне гісторыі беларускага літаратурнага працэсу і класіфікацыю